# Бібліятэчная справа ў рэспубліцы

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна адкрылася выстаўка, прысвечаная бібліятэчнай справе ў рэспубліцы. Экспанаты адлюстроўваюць дасягненні ў гэтай галіне за перыяд ад XVIII да XIX з'езда партыі.

На стэндах — творы В. І. Леніна і І. В. Сталіна з выказваннямі аб бібліятэчнай справе, а таксама важнейшыя пастановы партыі і ўрада па гэтаму пытанню. Вялікую цікавасць ўяўляе фотакопія праекта дэкрэта аб цэнтралізацыі бібліятэчнай справы з папраўкамі і заўвагамі В. І. Леніна.

Дыяграмы расказваюць аб росце бібліятэк у рэспубліцы. Нягледзячы на тое, што іх кніжныя фонды за час фашысцкай акупацыі былі знішчаны, бібліятэчная справа ў рэспубліцы рушыла намнога ўперад у параўнанні з даваенным часам. Калі ў 1940 годзе ў Беларусі працавала 3.716 масавых бібліятэк з кніжным фондам у 3.857,5 тыс. экземпляраў, дык у 1951 годзе іх было ўжо 6.714 з кніжным фондам у 8.129,4 тыс. экземпляраў.

Найбольш хутка расла колькасць сельскіх бібліятэк. У 1946 годзе іх было толькі 99, а зараз у рэспубліцы працуе 590 сельскіх і 2.118 калгасных бібліятэк.

Іх работу адлюстроўваюць дыяграмы, фотаздымкі, газетныя выразкі і другія матэрыялы.

Палеская абласная бібліятэка прадставіла на выстаўку альбом, прысвечаны Н. В. Гогалю. Наведвальнікі з цікавасцю разглядаюць яго. Альбом зроблены з любоўю і вялікім веданнем справы: тут і бібліяграфічныя спісы, і выказванні вялікіх людзей пра Гогаля, і водгукі чытачоў, і многа розных ілюстрацый.

Вялікую цікавасць прадстаўляе стэнд, які адлюстроўвае работу перасоўных бібліятэк. У адной толькі Баранавіцкай вобласці ёсць 1.027 перасоўных бібліятэк, апрача 102 масавых.

Бібліятэчныя работнікі і студэнты інстытутаў і тэхнікумаў актыўна наведваюць выстаўку.

**А. МЕЛАМЕД,**
**старшы бібліятэкар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна.**